# Ад заснавальніка

ARCHE будзе выходзіць у Менску.

Калі Незалежнасць сапраўды можа быць здабытая й засвоеная тут і цяпер, дык гэтае «тут» павязана з Менскам. Як кажа савецкая прыказка: дай фашысту нажом пад рабро — зробіш людзём дабро.

Мы будзем народным часопісам — для ўсіх тых, хто хоча жыць па-свойму і гаворыць па-свойму; бо культура — гэта любоў да свайго ладу жыцця.

Каб зажыць па-свойму, трэба па-свойму думаць.

ARCHE будзе часопісам вольнае народнае думкі, каб асэнсоўваць беларускую => сусветную рэчаіснасць як у мастацкім і філасафічным, так і ў палітычным сэнсе. Мы з асцярогай ставімся да любых праяваў інтэлектуальнага і мастацкага снабізму, баючыся ілюзіі, самападману.

Думаць — значыць шукаць праўды.

Праўда — простая, праўда — крывая. Не чакайце ад нас абсалютнага наватарства, прыгожасцяў, разумнасцяў, моды — гэта ўсё дым. Не чакайце ад нас гладкага мыслення; у папяровай мужнасці, эстраднай мудрасці няма праўды, няма й Беларусі. Бог не прыйдзе туды, дзе пра яго гавораць.

ARCHE створаны й робіцца, каб спрыяць здабыццю Незалежнасці.

Магчыма, ніколі раней у сведамай гісторыі нашага краю Незалежнасць не была такою блізкаю і таму тым больш жаданаю. Для кожнага чалавека — права на Незалежнасць ад машыны грамадства. Для грамадства — гарантыя Незалежнасці ад волі аднога асобнага чалавека, жменькі алігархаў ці інтарэсаў капіталу. Для здабыцця такой Незалежнасці нам трэба найперш палітычнай і творчай Незалежнасці краю — вызвалення з-пад расійскай духоўнай акупацыі, падаванай пад шыльдамі «славянскага адзінства» або «эканамічна неабходнага саюзу», бо расійская цывілізацыя, нягледзячы на ўсе рэформы, што да нас застаецца цывілізацыяй няволі: зачаста здымае яна з чалавека адказнасць *alias* годнасць.

ARCHE будзе часопісам, пісаным у жывой народнай мове.

Мы будзем найперш сачыць за якасцю тэкстаў, пільнуючыся, каб не паддацца паталогіі навязванай саўковай «нормы». Мы любім жаргоны, сацыялекты, дыялекты, нецэнзуршчыну.

* * *

Меркаванымі сюжэтамі наступных нумароў нашага часопіса стануць:
постмадэрн;
эміграцыя;
Вялікая Айчынная вайна;
марксізм, лявіца, нігілізм;
Прага;
Расія;
гомасэксуалізм і беларускі гомасэксуалізм;
Украіна;
нецэнзуршчына;
жанчыны, фемінізм;
Чарнобыль;
спорт;
жыды;

еўрапейская нацыя;
Менск;
тэатр Пінігіна;
хваробы, паталогіі, медыцына, здароўе...

Рэдакцыя ўзялася за падрыхтоўку гэтых сюжэтаў з вялікім энтузіязмам, але пры адначасовым усведамленні таго, што без Вашага, дарагі чытачу, удзелу, Вашых тэкстаў і перакладаў яны выйдуць такімі ж няпоўнымі, як і сюжэт першага нумару.

У рэдакцыйнай шуфлядзе ўжо ляжаць «Адкрыты твор» Умбэрта Эка, «Постмадэрны стан» Франсуа Ліятара, «Капіталізм і шызафрэнія» Жыля Дэлёза і Фэлікса Гватары, «Канец гісторыі» Фрэнсіса Фукуямы,«З вышыні птушынага палёту» Алега Дашкевіча, апавяданні Міколы Рабчука, Віктара Пялевіна, «Трактат пра мудакоў» Іздрыка, «Расказ прараба» Багдана Жолдака, «Грамадства відовішча» Гі Дэбора, «Шэршні» Пэтэра Гандке, вершы чэшскага вар'ята Івана Блатнага і Шэймаса Хіні, артыкул Сяргея Фяненкі пра Ларса фон Трыера, а таксама «Ноч Вальпургіі» Густава Майрынка ў перакладзе Васіля Сёмухі — усё гэта, але не толькі гэта, з'явіцца ў наступных нумарах.

* * *

Мы рыхтуем спецыяльны выпуск нашага часопіса «Беларускі нацыяналізм: 10 слаўных постацяў». Пяць постацяў мы вызначылі апытаннем рэдакцыйнага актыву — найбольш разоў былі названыя Антон Луцкевіч, Уладзімер Караткевіч, Сяргей Дубавец, Антон Адамовіч, Янка Станкевіч — вынікі нашае ўнутранае анкеты відавочна суб'ектыўныя, адлюстроўваюць пэўныя прыхільнасці сяброў рэдакцыі, ды, сказаць шчыра, нас саміх трохі здзівілі (анкета праводзілася тайна, без папярэдняга абмеркавання), і гэта пагатоў упэўніла ў тым, каб яшчэ 5 постацяў вызначылі вы. Дасылайце нам, калі ласка, лісты са спісамі 5-цёх, і мы прадставім дзесяць слаўных постацяў іх уласнымі тэкстамі або тэкстамі пра іх, або архіўнымі матэрыяламі, або інтэрвію з імі, або ўспамінамі пра іх.

Застаецца дадаць, што ва ўжо атрыманых анкетах, апроч памянёных, згадваліся Ф. Багушэвіч, К. Каліноўскі, Я. Карскі, М.Даўнар-Запольскі, А. Уласаў, М.Багдановіч, І. Луцкевіч, Янка Купала, Якуб Колас, В. Ластоўскі, У.Ігнатоўскі, Ігнат Канчэўскі, А. Чарвякоў, Б. Тарашкевіч, А. Цвікевіч, Ф. Аляхновіч, Н. Арсеннева, Л.Геніюш, В. Рагуля, М.Забэйда-Суміцкі, Б. Рагуля, ген. Вітушка, Я. Філістовіч; Р. Барадулін, Максім Танк, Ф. Янкоўскі, М.Раманюк, В. Быкаў, М. Ермаловіч, С. Яновіч, С. Шушкевіч, З. Пазьняк, Ю. Хадыка, Г. Сагановіч, А.Марачкін, У. Мулявін, А. Лукашэнка.

* * *

Наталка Бабіна, адна з аўтарак гэтага нумару, называе дыстанцыйны пульт тэлевізара «гёбельсам».

Дык кіньце ж гёбельса, уключыце беларускі народны тэлеканал «ARCHE». Прыемнага вам канца тысячагоддзя.

***Андрэй Дынько***